ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

9 ЖНІЎНЯ 2018 г.
ЧАЦВЕР
№ 15 (15846)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Наталля ЖУК:

# «ДЫХАЕМ» З МУЖАМ АДНОЙ ТЭМАЙ»

**Тры гады таму муж і жонка Аляксандр БАРШЧОЎ і Наталля ЖУК вырашылі, што хопіць працаваць на іншых і запусцілі ўласны брэнд Limitedminsk, які зараз вельмі папулярны ў моладзі. Крыніцай натхнення выбралі родную Беларусь. Так з'явіліся рэчы з вышыўкай у выглядзе саламянага зубра, бульбы з каларадскім жуком і надпісам-жартам «кароткачасовы дождж амаль без перапынку». «У нас столькі ідэй — не паспяваем усе рэалізаваць», — прызнаецца Наталля. З ёй мы пагутарылі пра тое, чым прыйшлося ахвяраваць дзеля свайго бізнесу, чаму дызайнеру важна глядзець паказы вядучых модных дамоў і што рабіць, калі няма натхнення.**

***— Калі былі школьніцай, кім марылі стаць?***

— З малога ўзросту казала маці, што хачу быць дызайнерам адзення. Я хадзіла на маляванне, мне вельмі падабалася. Бацькі не пярэчылі майму выбару. Хоць з модай з іх ніхто не звязаны: тата быў прадпрымальнікам, а мама — выкладчык матэматыкі і загадчык вучэбнай часткі сярэдняй школы.

Калі вучылася ў Інстытуце сучасных ведаў імя Шырокага, удзельнічала ў конкурсе «Млын моды». Паказвала свае калекцыі ў Швецыі, Літве, Латвіі, Швейцарыі. Пасля вучобы мяне запрашаў працаваць Цэнтр моды ў Мінску. Але там на той момант быў настолькі маленькі заробак, што яго хапіла б толькі на аплату здымнай кватэры (я сама з маленькага гарадка Івацэвічы). Таму вырашыла паехаць у Брэст, дзе шмат швейных прадпрыемстваў. І не пашкадавала: там фабрыкі развіваюцца хутчэй, чым у сталіцы.

Саша праходзіў практыку ў Івана Айплатава і потым супрацоўнічаў з ім. А пасля быў кіраўніком мастацкай групы на трыкатажнай фірме.

***— Чаму вас навучыла работа на вытворчасці?***

— Калі пачынаеш працаваць, разумееш, што ўсё не так, як сабе ўяўляў. Думала, буду прыходзіць на восем гадзін і ціха сабе маляваць. Насамрэч мастак на любым прадпрыемстве працуе 12 гадзін у дзень, бо ідэі ўзнікаюць пастаянна. Плюс на цябе кладзецца адказнасць перад усёй кампаніяй: ты павінен прадумаць калекцыю, выбраць тканіну, прапанаваць тое, што будзе прадавацца. Такія нервы! Але цікава. Гэты вопыт дапамагае ўсвядоміць, ці тым ты займаешся, паглядзець на індустрыю знутры, даведацца пра сістэму арганізацыі прадпрыемства. Разумееш, што без каманды нічога не атрымаецца — сам усё не зробіш.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Важацкі хлеб

# КАМУ ПА СІЛАХ УЗНАЧАЛІЦЬ «ДЫНАСТЫЮ»?

**Летам тысячы дзяцей весела бавяць час у лагерах адпачынку. Аднак за бесклапотнымі, на першы погляд, гульнямі і забаўкамі хаваецца насамрэч карпатлівая праца. Якім чынам яна арганізаваная? Адказ на гэтае пытанне карэспандэнты «Чырвонкі. Чырвонай змены» шукалі ў педагагічным атрадзе «Ветразь», у якім сёння распачынаецца чацвёртая, апошняя, змена.**

— У нас зараз знаходзяцца 240 дзяцей ва ўзросце ад 6 да 16 гадоў, — кажа **старшы педагог дзіцячага аздараўленчага лагера «Палітэхнік» Уладзімір САМУЛЕНКАЎ.** — Яны падзелены на 9 атрадаў. Для трэцяй змены мы абралі назвы вядомых гістарычных дынастый — Бурбоны, Цюдоры, Мін... Атрады скамплектаваны так, каб у іх уваходзілі дзеці прыкладна аднаго ўзросту плюс-мінус год. Усе важатыя — гэта або студэнты, або сёлетнія выпускнікі. Сярэдні ўзрост — 22-23 гады. У нашых шэрагах ёсць нават першакурснікі. Як правіла, яны самі неаднаразова прыязджалі ў лагер школьнікамі і таму добра ведаюць яго жыццё «знутры».

Сёлета ўвайсці ў «Ветразь» захацелі больш за 280 чалавек. Хоць атрад арганізаваны на базе БДПУ, але патэнцыяльныя кандыдаты прыходзяць з розных вышэйшых навучальных устаноў і нават каледжаў. Гэты год для атрада адметны: ён упершыню працуе на базе адразу двух лагераў — «Палітэхніка» і «Спадарожніка». У апошнім дагэтуль «Ветразь» працаваў ажно васямнаццаць гадоў.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Разумнікі і разумніцы

# «ЗАМЕСТ БАСЕЙНА РАШАЮЦЬ ЗАДАЧЫ»

## Як можна спалучыць адпачынак з матэматыкай і фізікай?

**Каля 300 вучняў сабрала XXIII Рэспубліканская летняя навукова-даследчая школа навучэнцаў і настаўнікаў, якая прайшла на базе спартыўна-аздараўленчага комплексу «Брыганціна». 80 працэнтаў яе ўдзельнікаў былі пераможцамі інтэлектуальных спаборніцтваў па матэматыцы, фізіцы, інфарматыцы і астраноміі самых розных узроўняў — ад абласнога да міжнароднага.**

Пачнём з таго, што дзённы расклад быў зусім не падобны на школьны: спецкурсы, лекцыі, практычныя заняткі распачыналіся ў 9.45, а ў 14.30 прадугледжвалася «цяхая гадзіна», якую большасць «шкаляроў» прысвячала самападрыхтоўцы. З 17.30 — спартыўныя гульні. Між іншым, і ў 20 гадзін навучальны дзень яшчэ не быў скончаны: увечары працягваліся кансультацыі, рэпетыцыі, ішла падрыхтоўка да выніковай канферэнцыі, праводзіліся ўнутраныя інтэлектуальныя спаборніцтвы.

Робататэхніка, канструяванне, для самых моцных матэматыкаў — інверсія, элементы тэорыі мноствaў, ураўненне Пеля. Газавыя законы і магнітныя з'явы — для будучых фізікаў. Камбінаторыка — для інфарматыкаў... У школе працавалі 18 навучальных груп, разлічаных на розны ўзрост і ўзровень засвоення той ці іншай дысцыпліны. Акрамя таго можна было наведваць лекцыі і семінары па псіхалогіі, малодшых школьнікаў запрашалі спецыяльныя заняткі па даследчай рабоце.

— Матэматыка — гэта агульная мова стасункаў для ўсіх: фізікаў, хімікаў, біёлагаў і астраномаў, — падкрэслівае **дэкан факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ, кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт Павел МАНДРЫК.** — Дысцыпліна — навука складаная, яе любіць трэба, але каму не цікава, той сюды не едзе. У нашай школе ўнікальная атмасфера: дзеці і ў футбол гуляюць, адпачываюць, і даследаванні праводзяць. У басейн часам ісці не хочуць, а сядзяць і задачкі рашаюць.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*